**Наталля Анофранка**

# Рэлігійныя і свецкія аспекты шлюбнага заканадаўства Расійскай імперыі ў першай палове XIX ст. (на прыкладзе заходніх губерняў)

**Natallia Anofranka**

**Religious and secular aspects of the marriage laws of the Russian Empire in the first half of the 19th c. (on an example of the western provinces)**

The article analyzed the processes of unification and codification of marriage laws of the Russian Empire in the first half of the 19th c. On the example of the western provinces changes of rules of marriages and divorces, defining their specifics for each Christian confession are shown.

*Keywords:* Grand Duchy of Lithuanian, Russian Empire, western provinces, church laws, consistory, marriages, divorces, marriage relations

**Наталія Анофранка**

**Релігійні та світські аспекти шлюбного законодавства Російської імперії в першій половині XIX ст. (на прикладі західних губерній)**

У статті проаналізовано процеси уніфікації і кодифікування шлюбного законодавства Російської імперії в першій половині XIX ст. На прикладі західних губерній показано зміни в правилах укладання і розірвання шлюбних відносин, виявлено їхні особливості для кожної з християнських конфесій.

*Ключові слова:* Велике князівство Литовське, Російська імперія, західні губернії, церковні закони, консисторія, укладення шлюбів браків, розірвання браків, шлюбні відносини

Уключэнне зямель былога Вялікага княства Літоўскага ў склад Расійскай імперыі ў выніку падзелаў Рэчы Паспалітай істотна паўплывала не толькі на палітычнае і сацыяльна-эканамічнае жыццё грамадства, але і закранула сферу шлюбна-сямейных адносін, якая ў XVIII ст. на землях ВКЛ рэгулявалася як царкоўнымі канонамі, так і нормамі Статута ВКЛ 1588 г.[1] Істотны ўплыў на сферу шлюбных адносін меў працэс яе ўніфікацыі, які пачаўся з 1806 г., калі па ініцыятыве Аляксандра I на паседжаннях «Непременного совета» было паднята пытанне пра раз-

настайнасць шлюбных правілаў у хрысціянскіх канфесіях і адзначана неабходнасць прывядзення іх да аднастайнасці[2]. У першую чаргу гэта датычылася двух ключавых момантаў – правілаў заключэння і скасавання шлюбных адносін.

У заканадаўстве Расійскай імперыі ўмовы заключэння шлюбу (адсутнасць перашкод да яго) амаль цалкам былі ўзяты з царкоўнага права. Абсалютнымі перашкодамі былі: няздольнасць або немагчымасць свядомага і свабоднага волевыяўлення; адсутнасць неабходнага ўзросту; фізічная няздольнасць да сужэнскага жыцця; наяўныя матрыманіяльныя сувязі; вычарпанасць колькасці шлюбаў (не больш за тры); духоўны сан і манаства, розніца ў веравызнаннях (шлюбы хрысціян з прадстаўнікамі іншых веравызнанняў); злачынствы, кроўнае і някроўнае сваяцтва[3]. Гэтыя нормы сталі аднолькавыя для ўсіх хрысціянскіх канфесій.

У той жа час пад уплывам грамадскіх тэндэнцый дзяржаўная ўлада на працягу першай трэці XIX ст. уносіла карэктывы ў правілы заключэння шлюбаў. У першую чаргу гэта датычылася павышэння ўзросту шлюбнага паўналецця, а таксама праблемы свабоднага волевыяўлення пры заключэнні шлюбу. Асабліва актуальнмі гэтыя праблемы былі для жаночай часткі грамадства.

Узрост шлюбнага паўналецця ў хрысціянскіх канфесіях адрозніваўся. У праваслаўнай царкве ён складаў для мужчын 15 год, а для жанчын 12 (13) год; у каталіцкай – для мужчын 14, жанчын – 12 год; у евангеліцкай – 16 год для ўсіх)[4]. У Вялікім княстве Літоўскім акрамя царкоўных канонаў шлюбны ўзрост агаворваўся ў Статуце ВКЛ 1588 г. і, напрыклад, для дзяўчын ён складаў 13 гадоў. Аднак, паводле даследчыкаў, ужо ў канцы XVIII ст. шлюбы ў такім маладым ўзросце былі рэдкімі[5]. А пасля далучэння зямель былога ВКЛ да Расійскай імперыі тэндэнцыя да павелічэння шлюбнага ўзросту ў грамадстве захавалася. У першай трэці XIX ст. у заходніх губернях замацаванню традыцыі больш позніх шлюбаў (асабліва ў асяродку вышэйшых саслоўяў) спрыяла развіццё сістэмы як мужчынскай, так і жаночай адукацыі. Напрыклад, дзяўчынкі ў 11–12 гадоў толькі паступалі ў навучальныя ўстановы, пры гэтым адукацыйны курс працягваўся 3–4 гады[6]. У сярэдзіне XIX ст. Е. Фялінская адзначала: «Цяпер 14–15-гадовыя дзяўчынкі апранутыя, як дзеці, у кароткія сукенкі, пад наглядам мэтраў і гувернантак мусяць

сядзець за секрэтэрам, вучыцца і выводзіць гамы. А раней у такім узросце выходзілі ў свет, або рабіліся маці»[7].

Са свайго боку дзяржаўнымі інстанцыямі ставілася пад сумненне правараздольнасць дзяўчынак 13–14 гадоў. Напрыклад, у канцылярыі Віцебскага, Магілёўскага і Смаленскага генерал-губернатара разглядалася справа Марцыяны Качаноўскай, якая, застаўшыся сіратой у 4 гады, выхоўвалася ў доме апекуна памешчыка Станіслава Багамольца. У 1823 г. ва ўзросце 13 гадоў дзяўчынка ўзяла шлюб з сынам апекуна Антоніем Багамольцам і падаравала яму свае спадчынныя ўладанні. У адпаведнасці са «статутным правам» Марцыяна з часу шлюбнага паўналецця (13 гадоў) мела права свабодна распараджацца сваёй уласнасцю, аднак гэта здзелка была пастаўлена пад сумніў як дваранскай апекай, так і губернскай адміністрацыяй. З'явіліся падазрэнні, што Качаноўская падаравала сваю маёмасць мужу несвядома, пад ціскам Станіслава Багамольца. Сама маладая жанчына тлумачыла, што выйшла замуж за Антонія Багамольца па асабістым жаданні, а родавы маёнтак адпісала мужу не пад прымусам па малалецтву, а для заспакаення апекуна. У выніку, губернская адміністрацыя прызнала акт даравання, але выказала прапанову, каб на дзяржаўным узроўні незамужнім дзяўчынам дазволіць упраўленне маёнткамі толькі па дасягненні 17 гадоў, а права распараджацца ім бесперашкодна (дарыць, прадаваць і г. д.) даваць толькі з 21 года[8].

Нарэшце, узрост шлюбнага паўналецця для прадстаўнікоў хрысціянскіх канфесій у Расійскай імперыі быў павышаны манаршым указам ад 19 ліпеня 1830 г. Сіноду было загадана: «забараніць святарам вянчаць шлюбы, калі жаніх і нявеста не дасягнулі яшчэ, першы – 18 гадоў, а апошняя – 16 гадоў»[9].

Праблема свабоднага волевыяўлення пры заключэнні шлюбу была больш складанай і для мужчын, і асабліва для жанчын. Кананічны ўзрост шлюбнага паўналецця прыводзіў да таго, што дзяўчыны не маглі самастойна і свядома прыняць адказнага рашэння[10]. Пра шлюбную партыю традыцыйна клапаціліся бацькі і апекуны, якія маглі ўлічваць або цалкам ігнараваць інтарэсы дзяўчыны[11][12]. У той жа час залежнасць ад бацькоўскага выбару супярэчыла ўмове свядомага і свабоднага волевыяўлення пры заключэнні шлюбу. Больш таго, любы прымус да заключэння шлюбу – пагрозы альбо фізічны

гвалт – з'яўляўся злачынствам, і такі шлюб мог быць прызнаны ад пачатку несапраўдным[13]. Аднак даказаць наяўнасць прымусу з боку бацькоў / апекуноў да непажаданага шлюбнага саюзу было складана, бо ён як правіла быў маральны і рэдка суправаджаўся відавочнымі прыкметамі. Да таго ж, у Расійскай імперыі дзецям забаранялася падаваць судовыя скаргі на бацькоў.

Сведчанні пра прымус з боку бацькоў / апекуноў да шлюбу адлюстраваны ў архіўных крыніцах, але не як асобныя скаргі, а ў выглядзе ўскосных аргументаў, якія маглі паўплываць на верагоднасць станоўчага вырашэння разводавых спраў. Напрыклад, у 1823 г. памешчыца Навагрудскага павету Вікторыя Абламовіч у прашэнні аб скасаванні шлюбу з Міхаілам Абламовічам, узгадвала пра прымус да шлюбу з боку бацькі (які ўжо памёр), хоць адкрыта яго і не абвінавачвала[14]. У 1829 г. Мінская праваслаўная духоўная кансісторыя разглядала разводавую справу памешчыцы Барысаўскага павета Дэліцыі Юзэфовіч. Разам з абвінавачваннямі мужа Аляксандра Юзэфовіча ў сужэнскай здрадзе і пабоях, памешчыца дадавала, што была прымусова выдадзена замуж сваякамі ў непаўнагадовым узросце[15].

Як абмежаванне свабоднага волевыяўлення пры заключэнні шлюбу можа разглядацца і адмова бацькоў / апекуноў даць сваю згоду (благаслаўленне) на гэты саюз. У адрозненні ад прымусу бацькоўская забарона на шлюб была легітымнай, абапіралася на грамадскія традыцыі і знаходзіла адлюстраванне ў свецкім заканадаўстве. Так, неабходнасць бацькоўскага бласлаўлення для заключэння шлюбу агаворывалася ў Статуце ВКЛ 1588 г. Напрыклад, за самавольны шлюб дачка магла быць пазбаўлена спадчынных правоў як у бацькоўскім, так і мацярынскім маёнтках[16]. У той жа час, у адпаведнасці з царкоўнымі канонамі бацькоўскае бласлаўленне не з'яўлялася абавязковай умовай для заключэння шлюбу. Такім чынам самавольна заключаныя сужэнскія саюзы прызнаваліся царкоўнымі ўладамі цалкам законнымі і сапраўднымі як у ВКЛ, так і пасля далучэння гэтай тэрыторыі да Расійскай імперыі[17].

У адрозненні ад ВКЛ у Расійскай імперыі канца XVIII – першай трэці XIX ст. права бацькоў на забарону шлюбу ў свецкіх законах не абумоўлівалася, хаця гэта праблема для грамадства была актуальнай.

Напрыклад, у 20-я гг. XIX ст. з’яўляліся звароты да царкоўных улад і грамадзянскай адміністрацыі ад жыхароў заходніх губерняў з патрабаванняміануляваць шлюбы дачок, якія былі «заключаны супраць волі бацькоў»[18].

Як сведчаць архіўныя дакументы, лёс такіх шлюбных саюзаў вырашаўся па-рознаму, у тым ліку і ў залежнасці ад інтарэсаў пануючай праваслаўнай царквы і палітыкі расійскага ўраду. У сітуацыі, калі шлюбный саюз адпавядаў дзяржаўным інтарэсам, адсутнасць бацькоўскага бласлаўлення не бралася пад увагу. Паказальны прыклад памешчыка Мінскай губерні Ксаверыя Галаўлі, які у 1823 г. патрабаваў ад Мінскай рымска-каталіцкай духоўнай кансісторыі скасаваць шлюб яго дачкі Францішкі з адвакатам Кавалеўскім. Памешчык абвінавачваў Кавалеўскага ў махлярстве, крадзяжы і падмане, аднак асноўным аргументам было тое, што дачка выйшла замуж без яго бацькоўскай згоды[19]. Мінская рымска-каталіцкая кансісторыя пастанавіла разлучыць сужэнцаў, і Францішка Галаўля была змешчана ў манастыр бернардзінак[20]. Знаходзячыся ў каталіцкім манастыры жанчына адаслала прашэнне ў Мінскую духоўную праваслаўную кансісторыю, ў якім выказала жаданне змяніць веравызнанне і далучыцца да праваслаўнай царквы[21]. Нягледзячы на аргументы бацькі, што пераход дачкі ў праваслаўе задуманы толькі для таго, каб «у іншым веравызнанні было магчыма застацца ў фальшывым сужэнстве, якое па рашэнню рымска-каталіцкай царквы скасавана», жаданне Францішкі было задаволена, а яе шлюб быў прызнаны законным[22]. Такім чынам, пераследуючы свае асабістыя інтарэсы, Францішка Галаўля змагла выкарыстаць пануючае становішча праваслаўнай царквы, а таксама дзяржаўную палітыку, накіраваную на павелічэнне колькасці праваслаўных вернікаў.

Пры незацікаўленасці дзяржавы ў захаванні самавольных сужэнскіх саюзаў, такія шлюбы маглі прызнавацца несапраўднымі. Напрыклад, у 1831 г. дваранка Дрысенскага павета Віцебскай губерні Агаф’я Твардаманская падала прашэнне на імя генерал-губернатара, у якім тлумачыла, што ў 1828 г. нарадзіла сына ад двараніна Мінскай губерні Ксаверыя Твардаманскага. Пасля гэтага яны ва ўніяцкай царкве пры сведках пабраліся законным шлюбам. Бацькі ж Ксаверыя Твардаманскага выступілі катэгарычна супраць гэтага сужэнскага саюзу і забаранілі

сыну пражываць разам з жонкай і сынам, у выніку чаго апошнія засталіся без сродкаў існавання. Гэта справа была перададзена на разгляд у Беларускую грэка-ўніяцкую кансісторыю, якая ў 1831 г. вырашыла, што адсутнасць згоды на шлюб з боку бацькоў Ксаверыя Твардаманскага з'яўляецца істотным парушэннем. Дадзены сужэнскі саюз афіцыйна быў прызнаны несапраўдным, а матэрыяльныя прэтэнзіі Агаф'і Твардаманскай – неабгрунтаванымі[23].

Толькі ў 1835 г. абавязковасць бацькоўскага бласлаўлення на шлюб набыла юрыдычнае афармленне. Дзецям абодвух палоў (у тым ліку і паўналетнім) было афіцыйна забаронена заключаць шлюб без бацькоўскага дазволу[24]. Гэта забарона ў «Зводзе законаў» была сфармулявана дастаткова лаканічна: «Забараняецца ўступаць у шлюб без дазволу бацькоў / апекуноў»[25]. Такім чынам, волевыяўленне тых, хто жадаў пабрацца шлюбам, абавязкова павінна было дапаўняцца «пануючай» воляй (бацькоў, апекуноў). Расійскія правазнаўцы XIX ст. такое наваўвядзенне ў расійскае заканадаўства тлумачылі як саступку з боку дзяржаўнай улады патрыярхальным сямейным традыцыям рускага грамадства[26].

Свабода волевыяўлення пры заключэнні шлюба (акрамя бацькоў / апекуноў) магла абмяжоўвацца і дзяржаўнай уладай. Напрыклад, дваранкі, якія былі прызначаны фрэйлінамі імператарскага двара, павінны былі атрымаць дазвол на шлюб ад манарха. Сафія Тызенгаўз, якая Аляксандрам I была прызначана фрэйлінай імператрыцы, узгадвала: «…калі вырашылася пытанне пра мой шлюб, я звярнулася, згодна звычаям рускага двара, да обер-гофмейстрыны, графіні дэ Літа, каб атрымаць ад іх імператарскіх вялікасцяў дазвол на мой шлюб»[27]. Таксама калі дзяўчыны жадалі ўзяць шлюб з вайскоўцамі, яны павінны былі атрымаць дазвол ад ваеннага начальства[28].

Дзяржаўная ўлада дастаткова жорстка магла абмяжоўваць права на шлюб тых, хто знаходзіўся пад паліцэйскім наглядам. Напрыклад, у 1829 г. дваранка Мінскай губерні ўдава Русецкая хацела ўзяць шлюб з графам Фадзеям Мастоўскім, які па загадзе галоўнакамандуючага Літоўскім асобным корпусам цэсарэвіча Канстанціна знаходзіўся ў Мінскай губерні пад паліцэйскім наглядам[29]. Каб прадухіліць гэты шлюб паліцыя накіравала зварот да духоўнага начальства. У выніку было загадана: «каб ніхто з падпарадкаваных духоўных асоб <…> не

толькі з удавой Русецкаю, але і з любой іншай жанчынаю не адважыліся блаславіць яго ў шлюбе, які ён жадае»[30].

У адрозненні ад зямель ВКЛ, дзе ў XVIII ст. разводавыя справы рэгуляваліся не толькі духоўнымі, але і свецкімі інстанцыямі і былі дастаткова частай з’явай[31], у Расійскай імперыі скасаванне шлюбных адносін знаходзілася ў юрысдыкцыі царквы. На працягу першай паловы XIX ст. пазіцыі духоўнай улады ў гэтай сферы ўмацоўваліся. Так, з 1 студзеня 1805 г. было забаронена вырашаць разводавыя справы без папярэдняга разгляду і пастановы Св. Сінода. У 1819 г., каб прадухіліць тэарэтычна магчымыя разводы на падставе шлюбных дамоў (якія былі распаўсюджаны на землях былога ВКЛ), расійскім урадам афіцыйна была прынятая пастанова «Пра нездзяйсненне дзяржаўнымі прысутнымі месцамі і асобамі абавязацельстваў і іншых актаў паміж сужэнцамі, у якіх заключаецца іх жаданне, якое схіляе да разрыву сужэнскага саюза». Гэтая пастанова была распаўсюджаная на ўсе хрысціянскія веравызнанні, нават на тыя, дзе шлюб не лічыўся таямніцай[32]. Статутам духоўных кансісторый (1841 г.) і Указам пра шлюбныя справы (1850 г.) канчаткова была аформлена царкоўная юрысдыкцыя ў шлюбных справах.

Падставы для спынення шлюбных адносін, як і формы разводу ў хрысціянскіх канфесіях былі рознымі, што выразна прасочвалася ў заходніх губернях. Па праваслаўным каноне падставамі для скасавання сужэнскіх адносін былі: смерць сужэнца; даказанае пралюбадзейства; бігамія (дваяшлюбнасць); фізіялагічная няздольнасць да сужэнскага жыцця (якая існавала да шлюбу); прысуд да катаржнай працы; нежаданне сужэнца-нехрысціяніна жыць з хрысціянінам; пераход у манаства абодвух сужэнцаў[33]. У адпаведнасці з правіламі рымска-каталіцкай царквы шлюб спыняўся: з-за смерці сужэнца; калі адзін з сужэнцаў прымаў манаства; у выпадку, калі духоўная ўлада прызнавала шлюб ад пачатку несапраўдным[34]. Астатнія прычыны маглі быць толькі падставай да сепарацыі (фактычнага разлучэння сужэнцаў, пры юрыдычным захаванні шлюбу)[35]. У адрозненні ад праваслаўных і католікаў, пратэстанты не лічылі шлюб таямніцай і мелі значна шырэйшыя прычыны для фактычнага разводу: парушэнне сужэнскай вернасці; доўгатэрміновая адсутнасць сужэнца (больш за 5 гадоў); агіда або няздольнасць да сэксуальнага жыцця; невылечныя венерычныя захворванні; вар’яцтва;

разбэшчанае жыццё; жорсткае абыходжанне і знявагі; даказаны намер забіць сужэнца; злачынствы, якія цягнуць смяротнае пакаранне ці высылку; сэксуальныя дэвіацыі[36].

У поліканфесійных заходніх губернях насельніцтва выкарыстоўвала розныя падставы для легальнага сказавання сужэнскіх адносін. Напрыклад, пры звароце да духоўных улад праваслаўных фігуравала абвінавачванне партнёра ў пралюбадзействе. Так, у 1809 г. настаўнік філасофіі мінскай семінарыі Павел Занчэўскі звярнуўся ў Мінскую духоўную кансісторыю з просьбай на законных падставах правесці следства ў адносінах разбэшчанага жыцця яго жонкі і дазволіць яму другі раз узяць шлюб. Сваю просьбу ён абгрунтоўваў тым, што яго жонка Алена «выхрышчаная з магаметанскага веравызнання», пражыўшы з ім некаторы час, пачала весці разбэшчанае жыццё. У 1808 г. яна сышла з дому і зрабілася «публічнай блудніцаю», за што была дастаўлена ў слуцкую гарадскую паліцыю. Мінская духоўная кансісторыя пастанавіла: «Шлюб прэфекта Занчэўскага з жонкаю яго Аленай, як па асабістым яе прызнанні, так і сведкамі паказаны, яўным яе блудадзействам парушаны»[37]. У выніку прэфект Занчэўскі атрымаў развод і дазвол на другі шлюб. На Алену Занчэўскую была накладзена епітымія – прымусовае змяшчэнне на 7 гадоў у слуцкі Ільінскі жаночы манастыр для пакаяння[38].

Католікі часцей шукалі прычыны, якія ад пачатку рабілі шлюб несапраўдным. Напрыклад, у 1823 г. памешчыца Навагрудскага павета Вікторыя Абламовіч, звяртаючыся ў духоўную інстанцыю ў якасці асноўнай прычыны для анулявання шлюбу называла блізкае радство з мужам. Яна пісала: «… усімі грамадзянскімі і духоўнымі законамі забараняецца асобам, якія знаходзяцца ў сваяцтве, выходзіць замуж. Бо будучы я стрыечнай сястрой мужа майго, каторы праз розныя хітрыя спосабы дасягнуў той мэты, што была звязана з ім шлюбам»[39].

Значна лягчэй было скасаваць шлюб пратэстантам. Напрыклад, Маркела Вагнер у вельмі маладым узросце пабралася шлюбам з Сэлерам, але «палічыўшы сябе няшчаснай», вярнулася ў бацькоўскі дом і пачала разводавую справу з мужам у Віленскай евангеліцкай кансісторыі. Праз некаторы час кансісторыя вынесла вердыкт пра скасаванне гэтага шлюбнага саюзу. Пры гэтым за Маркелай Вагнер (у шлюбе Маркела Сэлер) было захавана права заключыць новы шлюб[40].

Жаданне разарваць сужэнскія адносіны пры адсутнасці законных падстаў штурхала некаторых сужэнцаў да незаконных спосабаў. Найчасцей гэта было парушэнне абавязка на сумеснае пражыванне з сужэнцам[41]. Пры гэтым мужчыны часцей пакідалі жонак з мэтай завесці новую сям’ю, што ўжо разглядалася як злачынства супраць шлюбу. Адна з такіх спраў разглядалася мінскай паліцэйскай управай і земскім судом у 1806 г. Жонка калежскага актуарыўса Васільева Тэафілія Гражэвіч (у шлюбе Васільева) абвінавачвала мужа ў зланамерным пакіданні. У скарзе на імя Мінскага грамадзянскага губернатара яна пісала, што Васільеў узяў з ёй шлюб у Дзісне, аднак пасля трох гадоў сумеснага пражывання пераехаў у Мінск, кінуўшы яе з двума дзецьмі. Праз паўгады Тэафілія Гражэвіч пехатою з малалетнімі дзецьмі адправілася ў Мінск на пошукі мужа. Аднак знайшоўшы ў горадзе сужэнца, яна даведалася, што ён пражывае з нейкай Марыяй Гальштэйн, якую выдае за сваю законную жонку. У час следства паліцыяй было ўстаноўлена, што менавіта Тэафілія Гражэвіч з’яўлялася законнай жонкай. Пад ціскам доказаў Марыя Гальштэйн прызналася, што ніколі не вянчалася з Васільевым. У выніку справа аб пралюбадзействе Васільева з Марыяй Гальштэйн была перададзена з земскага суда ў кансісторыю і потым у Св. Сінод для вырашэння пытання аб пакаранні[42].

Пакіданне жонак і незаконныя другія шлюбы здараліся і ў асяродку арыстакратаў. Так, у 1821 г. княгіня Юзафіна Далгарукава, якая пражывала ў Кобрынскім павеце, абвінавачвала свайго мужа Уладзіміра Далгарукава ў тым, што ён пакінуў яе і пабраўся незаконным шлюбам з дачкой памешчыка Калужскай губерні Сцяпанава. Княгіня Далгарукава звярнулася са скаргай на мужа ў Мінскую рымска-каталіцкую кансісторыю, пасля чаго пытаннем законнасці другога шлюбу Уладзіміра Далгарукава пачалі займацца афіцыйныя ўлады[43].

У жанчын было менш магчымасцяў пакінуць свайго мужа, што было абумоўлена не толькі фінансавай і матэрыяльнай залежнасцю, але і правам мужа не даваць жонцы асобнага віду на жыхарства[44]. Напрыклад, у 1830 г. узнікла канфліктная сітуацыя паміж дваранінам Гродзенскага павета Серафімовічам і Гродзенскім губернскім праўленнем. Серафімовіч абвінавачваў губернскую адміністрацыю ў незаконнай (без мужнінага дазволу) выдачы жонцы пашпарта для паездкі ў Санкт-Пецярбург, куды яна і з’ехала, прыхапіўшы з сабой мужніны рэчы. Пакінуты і абрабаваны

муж запатрабаваў ад Гродненскага губернскага праўлення тэрмінова звязацца з Санкт-Пецярбургскім губернскім праўленнем з тым, каб яго жонка тэрмінова была выслана з Санкт-Пецярбурга да яго ў Гродзенскі павет[45].

Такім чынам пасля далучэння зямель былога ВКЛ да Расійскай імперыі пачаліся пераўтварэнні ў шлюбна-сямейнай сферы, якія датычыліся ўніфікацыі і кадыфікацыі шлюбна-сямейнага заканадаўства. У асноўным змены датычыліся правіл заключэння і скасавання шлюбных адносін. Умовы для заключэння шлюбаў былі ўніфікаваны на падставе праваслаўнага канона. Свецкі элемент праявіўся ва ўніфікацыі шлюбнага ўзросту і абавязковай згоды з боку бацькоў, апекуноў або начальства на шлюб. Скасаванне шлюбных адносін цалкам было перададзена ў юрысдыкцыю духоўных уладаў, а дзяржаўныя інстанцыі выконвалі ў асноўным дапаможныя функцыі. Правілы спынення шлюбных адносін і формы разводу ў кожнай канфесіі (праваслаўнай, каталіцкай, пратэстанцкай) былі рознымі. Гэта стварала розныя мадэлі шлюбных саюзаў, што выразна праяўлялася ў поліканфесійных заходніх губернях.

1 Дзербіна, Г. Права і сям’я ў Беларусі эпохі Рэнесансу – Мн.: Тэхналогія, 1997.

2 Развитие русского права в первой половине XIX века / Е. А. Скрипилев, С. И. Штамм, В. М. Клеандрова [и др.]; отв. ред. Е. А. Скрипилев. – М.: Наука, 1994. – С. 152.

3 Свод законов Российской империи, [повелением Государя императора Николая Первого составленный]: издания 1857 года – Санкт-Петербург: в типографии Второго отделения Собственной Его Императорского Величества канцелярии, 1857 (далей – СЗРИ). – Т. 11. – Ч. 1. – Ст. 206;

Суворов Н. С. Учебник церковного права – 2-е изд. – М.: А. А. Карцев, 1902. – С. 354-355;

Prawo cywilne obowiązujące w Krolewstwie Polskim: w 3-h t. – Warszawa: druk Józefa Zawadzkiego. – 1860. – T. 1. – Art. 23.

4 Оршанский, И. Г. Исследования по русскому праву обычному и брачному – СПб.: Тип. А. Е. Ландау, 1879. – С. 356.

5 Гардзіенка Н. С. Становішча жанчыны-шляхцянкі ў Вялікім княстве Літоўскім у XVIII ст.: Дыс. ... канд. гіст. навук – Мінск, 2003. – С. 33.

6 Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей – НГАБ). – Ф. 320. – Воп. 1. – Спр. 246. – Арк. 2.

[7] Felińska, E. Pamiętniki z życia Ewy Felińskiej: W 3 t. – Wilno: Józefa Zawadskiego, 1856. – T. 1. – S. 354.

[8] НГАБ. – Ф. 1297. – Воп. 1. – Спр. 5017. – Арк. 51, 62, 63-63 адв., 72, 73

[9] НГАБ. – Ф. 136. – Воп. 1. – Спр. 9036. – Арк. 4;
Суворов Н. С. Учебник церковного права. – С. 356.

[10] Felińska E. Pamiętniki z życia Ewy Felińskiej. – T. 1. – S. 388.

[11] Тамсама. – S. 453.

[12] Potocka A. Pamiętniki Anny hr. Potockiej – Warszawa: Drukarnia Granowskiego i Sikorskiego, 1898. – T. 1. – S. 39.

[13] Суворов Н. С. Учебник церковного права. – С. 355.

[14] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Гродна (далей – НГАБ у Гродна). – Ф. 6. – Воп. 1. – Спр. 38. – Арк. 1.

[15] НГАБ. – Ф. 136. – Воп. 1. – Спр. 8290. – Арк. 18.

[16] Ручной словарь, или Краткое содержание польских и литовских законов, служащих руководством в судебных тяжбах всякого рода, собранных для употребления в присутственных местах для пользы частных обывателей коронных и литовских провинций. – СПб.: Сенатская типография, 1810. – С. 38.

[17] Felińska E. Pamiętniki z życia Ewy Felińskiej. – T. 1. – S. 349-350.

[18] НГАБ. – Ф. 136. – Воп. 1. – Спр. 6159;
НГАБ. – Ф. 136. – Воп. 1. – Спр. 8109.

[19] НГАБ. – Ф. 136. – Воп. 1. – Спр. 6159. – Арк. 5-6.

[20] Там сама. – Арк. 24.

[21] Там сама. – Арк. 24-24 адв.

[22] Там сама. – Арк. 48-48 адв.

[23] НГАБ. – Ф. 1297. – Воп. 1. – Спр. 5783. – Арк. 1-2 адв., 5-5 адв.

[24] Победоносцев К. П. Курс гражданского права: в 3-х т. – 2-е изд., с переменами и доп. – СПб.: Тип. II Отд-ния Собств. Е. И. В. Канцелярии, 1875. – Т. 2: Права семейные, наследственные и завещательные. – С. 25.

[25] СЗРИ. – Т. 10. – Ч. 1. – Ст. 6.

[26] Победоносцев К. П. Курс гражданского права. – С. 25.

[27] Шуазель-Гуффье С. де. Исторические мемуары об императоре Александре и его дворе / Вступит. статья А. А. Кизеветтера / Пер. с франц. З. Мирович. – М.: К. Ф. Некрасов, 1912. – С. 208.

[28] НГАБ у Гродна. – Ф. 1. – Воп. 1. – Спр. 1110. – Арк. 1-3;
НГАБ. – Ф. 1430. – Воп. 1. – Спр. – 1011. – Арк. 1.

[29] НГАБ. – Ф. 136. – Воп. 1. – Спр. 8109. – Арк. 1.

[30] Там сама.

[31] Гардзіенка Н. С. Становішча жанчыны-шляхцянкі ў Вялікім княстве

Літоўскім у XVIII ст.: Дыс. ... канд. гіст. навук. – С. 40-41.

[32] Кулишер М. Развод и положение женщины – СПб.: Типо-лит. Б. М. Вольфа, 1896. – С. 226, 229;
СЗРИ. – Т. 10. – Ч. 1. – Ст. 46, 76.

[33] СЗРИ. – Т. 10. – Ч. 1. – Ст. 43, 45.

[34] Prawo cywilne obowiązujące w Krolewstwie Polskim. – T. 1. – Art. 60.

[35] Тамсама. – Art. 62-67.

[36] СЗРИ – Т. 11. – Ч. 1 – Ст. 251.

[37] НГАБ. – Ф. 136. – Воп. 1. – Спр. 2120. – Арк. 35.

[38] Тамсама. – Арк. 1, 35.

[39] НГАБ у Гродна. – Ф. 6. – Воп. 1. – Спр. 38. – Арк. 1-1адв.

[40] НГАБ у Гродна. – Ф. 6. – Воп. 1. – Спр. 315. – Арк. 2-2 адв.

[41] СЗРИ. – Т. 10. – Ч. 1. – Ст. 103.

[42] НГАБ. – Ф. 136. – Воп. 1. – Спр. 1781. – Арк. . 4-4адв., 7, 11, 13, 37-38.

[43] НГАБ у Гродна. – Ф. 1. – Воп. 1. – Спр. 2546. – Арк. 1, 13 адв., 14, 15.

[44] Оршанский И. Г. Исследования по русскому праву семейному и наследственному – СПб.: Тип. В. Безобразова и Ко, 1877. – С. 60.

[45] НГАБ у Гродна. – Ф. 1. – Воп. 3. – Спр. 987. – Арк. 4адв.-5.